Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ



Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

15 лютага 2012 года, № 3 (2062)

ВІДЭАМОСТ

## НА ПУЛЬСЕ СУСВЕТНАЙ НАВУКІ





Фота Аляксандра ВАЙЦЯХОВІЧА

***Першая міжнародная відэаканферэнцыя, прысвечаная Дню беларускай навукі, прайшла на базе БДУ 25 студзеня. Яе ініцыятарам выступіла Міністэрства адукацыі, а тэмай абмеркавання стаў уклад беларускіх ВНУ ў міжнародныя даследаванні фундаментальных уласцівасцяў матэрыі.***

У відэаканферэнцыі прынялі ўдзел міністр адукацыі прафесар *Сяргей Маскевіч*, рэктар БДУ акадэмік *Сяргей Абламейка*, дырэктар НДІ ЯП БДУ *Уладзімір Барышэўскі*, дырэктар НЦ ФЧВЭ БДУ *Мікалай Шумейка*. Да абмеркавання далучыўся таксама Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт, рэктар якога *Яўген Роўба* распавёў пра новыя распрацоўкі навукоўцаў ВНУ. На сувязь з калегамі з Беларусі выходзілі: прафесар, галоўны вучоны сакратар Аб'яднанага інстытута ядзерных даследаванняў (г. Дубна, Расія), кіраўнік групы супрацоўнікаў-удзельнікаў праекта ATLAS на Вялікім адронным калайдары (LHC) *Мікалай Русаковіч*; з Жэневы (CERN, Швейцарыя) кантактавалі прафесар, спецыяльны саветнік кіраўніка праекта CMS Еўрапейскай арганізацыі ядзерных даследаванняў, кіраўнік супрацоўніцтва Расіі і краін-удзельніц у праекце CMS *Ігар Галутвін* і супрацоўнік дэпартамента па сувязях з краінамі-няўдзельніцамі CERN *Марына Савіно*; ад лабараторыі Германскага электроннага сінхратрона (DESY, Гамбург – Цойтэн) выступіў прафесар, каардынатар супрацоўніцтва па пярэдняй каларыметрыі ў праекце Міжнароднага лінейнага калайдара (ILC), удзельнік праекта CMS на LHC *Вольфганг Леман*.

Размова вялася пра развіццё фундаментальнай навукі ў сучасным свеце і актыўны ўдзел ВНУ ў гэтым працэсе, а таксама пра міжнародную кааперацыю навукоўцаў і маладых даследчыкаў. Удзельнікі абмеркавалі сучасныя тэндэнцыі развіцця навукі і вызначылі магчымасці пашырэння супрацоўніцтва паміж універсітэтамі і навуковымі школамі, у тым ліку і ў адукацыйнай сферы.

**Алена МАРЦУЛЕВІЧ**

МАНІТОРЫНГ

## БДУ Ў ЭЛІЦЕ НАЙЛЕПШЫХ ВНУ СВЕТУ

***По апошніх даных Сусветнага вэбаметрычнага рэйтынгу ўніверсітэтаў (Webometrics Ranking of World Universities), апублікаваных у студзені 2012 г., БДУ падняўся на 365 пазіцый і заняў 843-е месца ў свеце.***




Рэйтынг складаецца восьмы год іспанскай даследчай лабараторыяй Laboratorio de Internet і абнаўляецца два разы ў год: у студзені і ліпені. У яго апошняй рэдакцыі прааналізавана 20372 вышэйшыя навучальныя ўстановы (усяго ў свеце налічваецца каля 30 тыс. універсітэтаў). Выніковы рэйтынг разлічваецца як сярэднеўзважанае 4-х паказчыкаў, па якіх БДУ мае наступныя пазіцыі: «бачнасць» – 963, «памер» – 2545, «адмысловыя файлы» – 1071 і «навука» – 465. Па паказчыку «навука» БДУ за паўгоддзе перамясціўся ўверх на 64 пазіцыі і ўвайшоў у 500 найлепшых універсітэтаў свету.

Сярод універсітэтаў краін СНД БДУ знаходзіцца на дзявятым месцы, прапусціўшы наперад толькі 8 расійскіх вышэйшых навучальных устаноў: МДУ, Томскі, Санкт-Пецярбургскі, Новасібірскі, МФТІ, МІФІ, Паўднёвы федэральны (Растоў), Казанскі федэральны ўніверсітэты.

Пяцёрка сусветных лідараў сёння выглядае так: 1 месца – Гарвардскі ўніверсітэт, 2 – Масачусецкі тэхналагічны інстытут, 3 – Стэнфардскі ўніверсітэт, 4 – Мічыганскі ўніверсітэт і 5 месца – Каліфарнійскі ўніверсітэт (Берклі). Найлепшым сярод еўрапейскіх універсітэтаў з'яўляецца Кембрыджскі ўніверсітэт – 24 месца.

Нагадаем таксама, што па рэйтынгу вядомага брытанскага агенцтва QS (QS World University Rankings 2011/12 (*www.topuniversities.com*)), які праводзіцца з 2004 г., у 2011 г. БДУ ўвайшоў у топ-700 найлепшых універсітэтаў свету і знаходзіцца ў групе ВНУ, якія займаюць 501–550 пазіцыі.

Такім чынам, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт уваходзіць у 3 % найлепшых універсітэтаў свету. Больш падрабязна пра месцы БДУ ва ўсіх сусветных рэйтынгах: *http://www.bsu.by/ru/main.aspx?guid=146761*.

**Паводле інфармацыі цэнтра праблем развіцця адукацыі**

### Чытайце ў нумары:

**АДЗІНКАВЫ ТАВАР І ЖАМЧУЖЫНЫ БЕЛАРУСІ**

Гутарка з першым прарэктарам Міхаілам ЖУРАЎКОВЫМ пра ўстаноўчы Прафесарскі сход

Стар. 2

**ПАДЗЯКА АЛЬМА-МАТАР**

Неўзабаве выйдзе кніга, прысвечаная 90-годдзю БДУ

Стар. 3

**ТВОРЧЫ ДЭСАНТ ДЛЯ ЕЎРОПЫ**

Размова з дырэктарам Інфапункта Савета Еўропы Ігарам ГОРСКІМ пра рэспубліканскі конкурс і стэрэатыпы

Стар.4

**НА ЎКЛАДЫШЫ ГАЗЕТЫ**

чытайце цікавосткі ад Псіхалагічнай службы БДУ

### Весткі з рэктарата

ДЫПЛОМЫ доктара навук і атэстаты прафесара ўручыў 7 лютага навуковым і навукова-педагагічным работнікам Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка. З БДУ дыпломы доктара навук атрымалі дацэнт кафедры неарганічнай хіміі хімічнага факультэта *Наталля Лясная*, дацэнт кафедры тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства філалагічнага факультэта *Алена Суркова* і намеснік дэкана па адукацыйных інавацыях і вучэбна-метадычнай рабоце юрыдычнага факультэта *Вольга Чупрыс*. Атэстат прафесара ўручаны доктару хімічных навук *Андрэю Блахіну*.

* * *

МЕМАРАНДУМ аб сумеснай дзейнасці моладзевых грамадскіх аб'яднанняў і органаў студэнцкага самакіравання БДУ падпісалі 7 лютага сакратар камітэта пярвічнай арганізацыі ГА «БРСМ» БДУ Сяргей Клішэвіч, старшыня Студэнцкага саюза БДУ Настасся Гвардзіян, старшыня Савета старастаў Алег Букатых і старшыня Студэнцкага савета па якасці адукацыі Дар'я Волкава. У цырымоніі бралі ўдзел рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка і прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Уладзімір Сувораў.

Дакумент прадугледжвае развіццё супрацоўніцтва паміж моладзевымі арганізацыямі ВНУ, умацаванне партнёрскіх адносін з мэтай сумеснага ўдзелу ў рэалізацыі дзяржаўнай моладзевай палітыкі.

* * *

ВЯДОМЫ расійскі эканаміст Міхаіл Дзялягін 6 лютага выступіў з лекцыяй перад студэнтамі БДУ і адказаў на пытанні.

*Міхаіл Дзялягін* – публіцыст і палітык, правадзейны член Расійскай акадэміі прыродазнаўчых навук, доктар эканамічных навук, дырэктар Інстытута праблем глабалізацыі, старшыня партыі «Радзіма: здаровы сэнс». Аўтар больш за 900 артыкулаў і 12 манаграфій. Кіраўнік аўтарскага калектыву кнігі «Практыка глабалізацыі: гульні і правілы новай эпохі» (2000), у суаўтарстве з В. Шаянавым напісаў кнігу «Свет навыварат. Як скончыцца эканамічны крызіс для Расіі» (2009).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

АКТУАЛЬНА

# ПРАФЕСАРЫ, ВАМ СЛОВА!

***Першае пасяджэнне Прафесарскага сходу БДУ прайшло 9 лютага ў актавай зале Інстытута журналістыкі. У ім узялі ўдзел каля 300 прафесараў і дактароў навук, якія абралі прэзідыум і старшыню, а таксама вызначылі асноўныя кірункі і мэты дзейнасці.***





Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

Прафесарскі сход – гэта супольнасць навукова-педагагічных работнікаў комплексу БДУ. На яго мэце кансалідацыя найбольш аўтарытэтнай часткі навукова-педагагічных супрацоўнікаў універсітэта і садзейнічанне фарміраванню пазітыўнай грамадскай думкі, рэалізацыі праграм і планаў ВНУ ў сістэме вышэйшай адукацыі Беларусі, забеспячэнню гарантый якаснай падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй і кадраў вышэйшай кваліфікацыі, а таксама актыўнаму ўваходжанню БДУ ў сусветную адукацыйную прастору.

Асноўнымі задачамі вызначаны – спрыянне арганізацыі адукацыйнага працэсу, удзел у складанні праграм і перспектыўных планаў развіцця ўніверсітэта, факультэтаў, кафедраў і навукова-даследчых лабараторый, садзейнічанне стварэнню спрыяльных умоў для навуковай дзейнасці ва ўніверсітэце, захаванню і развіццю яго навуковых школ, фарміраванню высокіх прафесійных і маральных якасцяў у навучэнцаў і маладых спецыялістаў. Плануецца, што дзейнасць сходу дазволіць аптымізаваць адукацыйны працэс у БДУ, паскорыць развіццё фундаментальных і прыкладных навук, інавацыйных распрацовак ВНУ.

Першае пасяджэнне насіла азнаямленчы характар. З падрабязным дакладам выступіў рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка. Гаворка ішла пра развіццё ўніверсітэта з 2006 па 2011 гг. Разглядаліся пытанні навуковай, адукацыйнай дзейнасці, праблемы фінансавання. Нямала ўвагі было нададзена катастрафічнаму старэнню кадраў сярод прафесарска-выкладчыцкага складу і спосабам яго перааднаўлення. Асобна былі адзначаны поспехі і дасягненні БДУ ў 2011 г., асабліва прасоўванне ў міжнародных рэйтынгах.

Са сваімі прапановамі выступілі і прысутныя прафесары, якія ўхвалілі гэту ініцыятыву і зацвердзілі палажэнне. Быў сфарміраваны прэзідыум Прафесарскага сходу БДУ з 9 чалавек. У яго складзе: доктар тэхнічных навук *Барыс Паньшын*, доктар фізіка-матэматычных навук *Васіль Стражаў*, доктар гістарычных навук *Вячаслаў Мянькоўскі*, доктар філалагічных навук *Таццяна Валынец*, доктар фізіка-матэматычных навук *Мікалай Юрчук*, доктар тэхнічных навук *Віктар Краснапрошын*, доктар юрыдычных навук *Рыгор Васілевіч* і доктар медыцынскіх навук *Уладзімір Дамарацкі*.

На першым пасяджэнні члены прэзідыума абралі старшынёй акадэміка *Анатоля Лесніковіча*. Акрамя таго, мяркуецца стварыць 9 камісій па пэўных кірунках. У бліжэйшых планах – камплектаванне іх дзейнымі сябрамі Прафесарскага сходу.

Увайсці ў склад ПС можа любы супрацоўнік БДУ, якія мае вучоную ступень доктара навук і / або вучонае званне прафесара.

**Таццяна МАЛЯРОВА**

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# Пра адзінкавы тавар і жамчужыну дзяржавы

***Напярэдадні гістарычнага Прафесарскага сходу БДУ мы пагаварылі з першым прарэктарам прафесарам Міхаілам ЖУРАЎКОВЫМ пра прычыны дадзенай ініцыятывы, спадзяванні, якія на яе ўскладаюцца, і эліту ўніверсітэта.***

***– Адным з першых крокаў Сяргея Абламейкі на пасадзе рэктара БДУ яшчэ 15 студзеня 2009 г. была сустрэча з заслужанымі работнікамі, на якой абмяркоўваліся перспектывы БДУ. Ці можна лічыць скліканне Прафесарскага сходу працягам гэтай палітыкі?***

– Так, гэта «з аднаго гнязда птушкі». Галоўныя дзейныя асобы ва ўніверсітэце – студэнты і выкладчыкі, сярод якіх найбольш аўтарытэтнымі з'яўляюцца прафесары. Яны – эліта ўніверсітэта, якую трэба берагчы, «песціць», трэба «гадаваць». Асноўная мэта стварэння Прафесарскага сходу – больш актыўна і эфектыўна выкарыстоўваць вопыт прафесараў, дактароў навук пры вырашэнні асабліва важных пытанняў дзейнасці ўніверсітэта, рэалізацыі праграм і планаў яго развіцця.

І мне і Сяргею Уладзіміравічу даводзіцца чуць ад прафесараў, што «прафесура» недастаткова актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці ўніверсітэта, што не заўсёды ёсць магчымасць выказаць сваё меркаванне, сваю ідэю. Вось рэктар і паспрабуе на першым прафесарскім сходзе пазначыць важныя напрамкі работы, каб мы сумесна папрацавалі над рашэннем актуальных для ўніверсітэта задач.

***– Такога кшталту аб'яднанні досыць распаўсюджаная з'ява ў Расіі. Вось і ў Гродзенскім універсітэце паспрабавалі стварыць нешта падобнае. Можа, нешта ўзялі ў калегаў?***

– Наогул, гэта ідэя выспела сама сабой, хоць прафесарскія сходы / саветы існуюць у многіх універсітэтах свету. Але наш прафесарскі сход істотным чынам адрозніваецца ад аналагічных структур у Расіі тым, што там гэта грамадскія арганізацыі са сваімі статутамі, членскімі ўнёскамі і фінансамі...

***– І, як правіла, рэгіянальныя…***

– Менавіта так. У нас жа прафесарскі сход – гэта супольнасць прафесараў і дактароў навук універсітэта – гэта частка нашага працоўнага калектыву, якой не абыякавы лёс БДУ. Таму і ў працы ПС мы не ўсталёўваем ніякіх квот. Прыйдуць на першы сход усе 300 чалавек – выдатна, пажадае затым актыўна працаваць 50–100 чалавек, якім праблематыка будзе цікавая – велізарнае ім дзякуй.

Але кіруючы орган усё роўна павінен быць. Мы правялі апытанне сярод прафесуры і хочам прапанаваць прэзідыум з 9 чалавек. Ён будзе накіроўваць працу ПС, ставіць праблемы, камплектаваць групы і камісіі. Яго старшыня, спадзяёмся, возьме актыўны ўдзел у працы рэктарата.

***– Дык якія пытанні трапяць на разгляд Прафесарскага сходу?***

– Мы неаднаразова збіраліся з ініцыятыўнай групай па праекце ПС і разважалі над найбольш надзённымі праблемамі. Напрыклад, што ж рабіць са старэннем кадраў, як захаваць нашы навуковыя школы і напрамкі. Таму што сітуацыя зараз складаная – моладзь неахвотна ідзе ў навуку. Вядома, гэта праблема не толькі нашага ўніверсітэта, а і краіны наогул, ды і ў Еўропе падобная сітуацыя. Яшчэ якім быць універсітэту будучыні, якія спецыяльнасці развіваць, як цяпер вучыць студэнтаў? Цяпер зусім па-іншаму будуецца навучальны працэс, і не толькі ў плане тэхнічных сродкаў, а ўвогуле ўзаемаадносін паміж выкладчыкам і студэнтам. Раней выкладчык галоўным чынам трансляваў веды – распавядаў, «начытваў» тое, што трэба было вывучыць – цяпер гэтага зусім не дастаткова.

Мы ўжо задумваемся пра 100-гадовы юбілей універсітэта. І не таму, што «вельмі хочацца святкаваць», а каб БДУ да сваёй векавой мяжы падышоў як мага больш самавіта, годна. Мы хочам, каб універсітэт стаў сапраўды вядучай ВНУ ў Еўропе, куды б імкнуліся паступіць маладыя людзі з усяго свету. Але як быць з выкладаннем на замежнай мове? Колькі мы і іншыя ВНУ ні спрабавалі, высветлілася, што не зусім проста перайсці, напрыклад, на навучанне на англійскай нават на быццам бы «прыдатных» спецыяльнасцях. Ну чаму так? Як дзейнічаць далей?

Пытанняў вялікая колькасць. Для іх вырашэння патрэбны досвед, веды, сур'ёзныя і ўдумлівыя развагі. Наша «сфера дзейнасці» не выносіць рэзкіх змяненняў, але разам з тым нельга рухацца павольна, каб не адстаць ад іншых.

***– Сход дапаможа і самім прафесарам у асабістым плане…***

– Вядома, бо многія прафесары практычна «замкнуліся» на сваіх кафедрах, на факультэтах. Мы спадзяёмся, што дзякуючы ПС яны пачнуць больш актыўна камунікаваць паміж сабой, пашырыцца дыяпазон іх узаемадзеяння. Таму што прафесура – гэта такая тонкая структура, а кожны прафесар – адзінкавы тавар, яны вельмі чулівыя, але многія разам з тым бываюць і занадта суб'ектыўныя ў дачыненні да сябе. У параўнанні ж з іншымі яны змогуць больш рэальна сябе праявіць. Хочацца, каб яны дзяліліся вопытам, арганізоўвалі праблемныя семінары, і не толькі па тэматыцы сваіх даследаванняў, а па агульных навукова-педагагічных пытаннях, прысвечаных агульнаўніверсітэцкім каштоўнасцям.

***– Чаму наспела рэалізацыя гэтай ідэі менавіта цяпер?***

– Мы даўно хацелі арганізаваць нешта такое, але ў сувязі з 90-годдзем адклалі. Менавіта юбілей ярка паказаў неабходнасць такой структуры. Тады пры вырашэнні многіх пытанняў адчуваўся недахоп кампетэнтных меркаванняў. Напрыклад, вельмі добры праект, які рэалізавалі прэс-служба сумесна з гісторыкамі, – «Гэты дзень у гісторыі» на сайце БДУ. Колькі тытанічнай працы ім спатрэбілася, каб знайсці нейкія звесткі, але паступаюць заўвагі: вось тую падзею прапусцілі, яшчэ нешта не ўлічылі. Ці ў афармленні рэктарата пры стварэнні галерэі нашых заслужаных людзей – цяпер кажуць, вы таго і таго не згадалі. Усім разам прасцей ліквідаваць прабелы ў летапісе ўніверсітэта.

Яшчэ, на мой погляд, недастаткова робіцца па папулярызацыі ўніверсітэта ў СМІ. Я не кажу пра бягучыя падзеі, яны вельмі добра і падрабязна асвятляюцца і ў газетах, і ў часопісах, і на ТБ. Але нашы прафесары павінны больш выступаць і на агульныя тэмы: роля і месца ўніверсітэта ў грамадстве, каб склаўся ўстойлівы вобраз БДУ як адной з жамчужын дзяржавы.

***– Адной з задач ПС прапісана праца з грамадскасцю…***

– Нам трэба ўсталяваць сувязь з гарадскімі ўладамі не на адміністрацыйным афіцыйным узроўні, а ў плане больш «нефармальных» зносін пры данясенні і тлумачэнні нашых задач і планаў. Напрыклад, ва ўніверсітэце адчуваецца адсутнасць спецыялізаванага цэнтра, памяшканняў для нефармальных зносін і камунікацыі паміж членамі нашага калектыву. Выкладчыкам і пагутарыць паміж сабой па сутнасці няма дзе. Той будынак, які мы б хацелі пабудаваць на Ленінградскай, якраз і задумваецца як культурна-грамадскі цэнтр. Там павінны быць і кавярні, і нават більярдная, месцы адпачынку і чытальныя залы для сустрэч і зносін ППС паміж сабой і са сваімі калегамі з іншых ВНУ.

Прафесарскі сход прадугледжвае стварэнне камісій, магчыма, гэта будуць і «клубы па інтарэсах», на пасяджэннях якіх будуць абмяркоўвацца актуальныя пытанні. У такім культурна-грамадскім цэнтры было б прыемна збірацца.

***– Прыцягненне да прыняцця найважнейшых рашэнняў заслужаных работнікаў – каштоўная ідэя, але, каб дасягнуць добрага эфекту, яны павінны валодаць рэальнымі паўнамоцтвамі. Як з гэтым?***

– Безумоўна, мы над гэтым сур'ёзна думалі. Калі людзі не маюць ніякіх паўнамоцтваў, а проста эпізадычна збіраюцца, то нічога з гэтага не атрымаецца. ПС мусіць працаваць на рэгулярнай аснове, і асабліва прэзідыум і камісіі. У найбліжэйшы час мы ім абавязкова знойдзем прыдатныя памяшкання, каб кожны прафесар ведаў, куды прыйсці са сваімі прапановамі. У Палажэнні пакуль прапісаны рэкамендацыйны характар рашэнняў ПС, але наконт паўнамоцтваў для старшыні і прэзідыума мы будзем далей думаць, можа, нават прыйдзецца дапаўняць статут універсітэта. Але пакуль не будзем спяшацца і паглядзім, як наогул «запрацуе» прафесарскі сход, як увасобіцца ў жыццё яго ідэя.

**Гутарыў Сяргей ШАФАЛОВІЧ**

HI-ТЕСН

# ВК-дысплэі стануць таннейшымі

***З кожным годам супрацоўніцтва паміж БДУ і замежнымі навуковымі арганізацыямі ўмацняецца. Нашымі вядучымі партнёрамі з'яўляюцца арганізацыі з КНР. Пра адзін з навуковых праектаў на 2011–2012 гг. нам расказаў загадчык лабараторыі оптыкі кандэнсаваных асяроддзяў НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі Валерый ЛАПАНІК.***



– Знаёмства нашай лабараторыі з калегамі з Хэйлунцзянскага інстытута нафтахіміі пачалося ў 2010 г. на міжнароднай выставе ў Харбіне. Кітайскіх навукоўцаў зацікавілі нашы распрацоўкі па стварэнні вадкакрышталічных (ВК) матэрыялаў новага пакалення для выкарыстання ў шырокім спектры дысплэяў. Было заключана папярэдняе пагадненне аб намерах, а ў чэрвені 2011 г. у Харбіне быў падпісаны кантракт па навуковай распрацоўцы шырокатэмпературнага вадкакрышталічнага матэрыялу для розных сістэм адлюстравання інфармацыі.

Наша лабараторыя з'яўляецца адной з найбуйнейшых у свеце па распрацоўцы ВК-матэрыялаў, і факт плённага супрацоўніцтва з Паўднёвай Карэяй, Нарвегіяй, Германіяй, Польшчай сыграў сваю ролю. Мы змаглі прапанаваць недарагі даследчы працэс за кошт танных метадаў ачысткі ВК-матэрыялаў, а таксама матэрыялаў, якія дазваляюць скараціць працэс сінтэзу на 2–3 стадыі ў параўнанні з ужо вядомымі метадамі. Таму і самі прадукты (маніторы, тэлевізары, інфармацыйныя табло) будуць таннейшымі, чым у іншых фірмаў.

У нашай краіне пры наяўнасці рэсурсаў адсутнічаюць належныя магутнасці і плошчы, дзе б выраблялiся сучасныя актыўна-матрычныя дысплэі, а таксама адладжваўся б выпуск вытворных матэрыялаў. У перспектыве пытанне пашырэння можа быць вырашана, калі супрацоўніцтва з прадстаўнікамі Хэйлунцзянскага інстытута нафтахіміі будзе плённым.

Надоечы адбылася планавая паездка ў Харбін. На сустрэчы былі прэзентаваны методыкі сінтэзу дванаццаці злучэнняў і адпаведныя ім узоры. Навукоўцы з кітайскага боку з вялікай цікавасцю пераймаюць распрацаваныя намі методыкі сінтэзу, разумеючы, што паводле вынікаў гэтага праекта Хэйлунцзянскі інстытут нафтахіміі можа стаць вядучым у КНР у дадзенай сферы. Тады ж адбылася сустрэча з прэзідэнтам Хэйлунцзянскай акадэміі навук. Ён адзначыў, што БДУ сёння асноўны навукова-тэхнічны партнёр, з якім планueцца супрацоўнічаць у галіне новых матэрыялаў і тэхналогій для электроннай прамысловасці і распрацоўкі праграмнага забеспячэння.

Разам з паэтапным ажыццяўленнем дадзенага праекта разгортваецца ідэя новага па тэме «Арганічныя люмінафоры для дысплэйных ужыванняў», таму што супрацоўніцтва з Хэйлунцзянскім інстытутам нафтахіміі плануецца доўгатэрміновым. Дарэчы, методыкі, якія распрацоўваюцца для гэтага навуковага праекта, рэалізуюцца адпаведна з Праграмай развіцця БДУ на 2011–2015 гг.

**Юлія МАЛУХА**

З НАГОДЫ

# Падзяка альма-матар

***Эфектную рысу пад святкаваннем юбілею БДУ падвядзе выхад у канцы лютага кнігі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт у юбілейны год. 90 гадоў». Кніга будзе выдадзена тыражом у 1 тыс. асобнікаў і стане годнай візітоўкай галоўнай ВНУ краіны.***

За два месяцы ўпраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы зрабіла вялікую працу па складанні канцэпцыі, зборы і апрацоўцы інфармацыі, адборы фотаматэрыялаў. Актыўны ўдзел у падрыхтоўцы кнігі прынялі многія кіраўнікі нашай ВНУ. Узначальваў аўтарскі калектыў і курыраваў увесь працэс рэктар акадэмік Сяргей Абламейка.

У юбілейным выданні адлюстравана шматгранная дзейнасць флагмана айчыннай вышэйшай школы, устаноў адукацыі, навукова-даследчых падраздзяленняў, вытворчых прадпрыемстваў, якія ўваходзяць у комплекс БДУ.

У пачатку кнігі прыведзены віншаванні кіраўніка дзяржавы А. Р. Лукашэнкі, Прэм'ер-міністра М. В. Мясніковіча, міністра адукацыі С. А. Маскевіча, старшыні Прэзідыума НАН Беларусі А. М. Русецкага, Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, і рэктара БДУ С. У. Абламейкі. У іх адзначаюцца значныя дасягненні Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і падкрэсліваецца яго вядучая роля ў нацыянальнай сістэме адукацыі.




У першай частцы падрабязна прааналізаваны вынікі працы за апошняе дзесяцігоддзе і вызначаны далейшыя задачы. У інтэрв'ю «Грані будучыні» акадэмік Сяргей Абламейка адзначае высокі рэйтынг універсітэта сярод вядомых ВНУ ў свеце і распавядае пра складнікі гэтага поспеху: інфарматызацыю БДУ, адукацыйныя тэхналогіі, падтрымку маладых навукоўцаў і інш. У асобным раздзеле сабраны выказванні нашых прарэктараў пра найважнейшыя падзеі і перспектывы БДУ.

У другой частцы прадстаўлены агляд урачыстых мерапрыемстваў з нагоды юбілею БДУ, а таксама прыведзены звесткі пра гісторыю і развіццё Белдзяржуніверсітэта, вядомых навукоўцаў і выкладчыкаў. Змяшчаюцца віншаванні ад самых вядомых выпускнікоў БДУ, многіх вышэйшых навучальных устаноў і арганізацый замежных дзяржаў. У кнізе даецца інфармацыя пра супрацоўнікаў, удастоеных дзяржаўных узнагарод, а таксама адзначаных рознымі ўстановамі і ведамствамі, названы найлепшыя выпускнікі і заслужаныя работнікі БДУ. У канцы перадлічана публікацыі пра 90-годдзе БДУ ў шматлікіх сродках масавай інфармацыі.

Дадзеная кніга прызначана для шырокага кола чытачоў.

**Таццяна МАЛЯРОВА**

КРУГЛЫ СТОЛ

# Ці ёсць крызіс у сацыялогіі?

***30 студзеня на кафедры сацыялогіі ФФСН адбылася сустрэча з вядомым расійскім навукоўцам-сацыёлагам, членам-карэспандэнтам РАН, галоўным рэдактарам акадэмічнага часопіса «Сацыялагічныя даследаванні» Жанам Тошчанкам.***

Размова ішла пра тэндэнцыі сучаснай сацыялогіі. Цяпер у ВНУ Расіі працуе больш за 40 сацыялагічных факультэтаў, штогод выпускаецца каля 10 тысяч дыпламаваных сацыёлагаў. У ВНУ Беларусі працуе 5 сацыялагічных аддзяленняў, сама навука выкладаецца на ўсіх факультэтах. Сацыялогія вывучае праблемы сучаснага грамадства, дапамагае яму ўстойліва функцыянаваць, своечасова папярэджваць магчымыя непаразуменні і супярэчнасці. Абмяркоўвалася таксама пытанне інтэграцыі сацыялогіі і іншых чалавеказнаўчых навук – псіхалогіі, педагогікі, філасофіі, гісторыі і інш., а таксама іх сумеснай адказнасці за ўплыў на развіццё і стабільнасць грамадства.

З трывогай удзельнікі сустрэчы канстатавалі зніжэнне метадычнай культуры сучасных сацыялагічных даследаванняў, азначыўся разрыў сацыялагічнай думкі з рэальным жыццём. Пры гэтым Ж. Ц. Тошчанка лічыць, што крызісу сацыялогіі няма, магчымы «крызіс у творчасці асобных сацыёлагаў». Закранута была таксама праблематыка глабалізацыі, даследаванні штодзённасці і іншыя актуальныя пытанні жыцця сучаснага грамадства.

Напрыканцы прафесар Тошчанка падарыў кафедры свае новыя працы: «Кентаўр-праблема (вопыт філасофскага і сацыялагічнага аналізу)», «Сацыялогія кіравання», «Тэзаўрус сацыялогіі» і інш. Беларускія калегі ўручылі госцю серыю ўніверсітэцкіх кніг «Кафедра сацыялогіі», якая ўключае працы прафесараў П. П. Украінец, Д. К. Безнюка, Л. Р. Цітарэнкі, Я. А. Качынай, А. У. Рубанава, дацэнта С. Н. Буравай, а таксама новы навучальны дапаможнік прафесараў А. М. Данілава і А. Н. Елсукова «Гісторыя сацыялогіі», манаграфію прафесара А. Я. Кучко «Сацыялогія інавацый», нумары часопісаў «Сацыялогія», «Філасофія і сацыяльныя навукі» і «Веснік БДУ».

Удзельнікі сустрэчы выказалі шчырую падзяку прафесару Ж. Ц. Тошчанку за карысныя і высокапрафесійныя зносіны.

**П. П. УКРАІНЕЦ,**
**доктар гістарычных навук**

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

*Шаноўныя калегі!*

***Ад сябе асабіста і ад усяго шматтысячнага калектыву Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта сардэчна віншую Вас з юбілеем.***

***Мы ад усёй душы рады пажадаць Вам добрага здароўя, уласнага шчасця, шмат гадоў натхнёнай працы на карысць нашага ўніверсітэта.***

*Рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка*

*3 лютага*

**Манаеў Алег Цімафеевіч,** прафесар кафедры сацыяльнай камунікацыі, доктар сацыялагічных навук

*7 лютага*

**Фядотаў Аляксандр Кірылавіч,** загадчык кафедры энергафізікі, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар

**Блахін Андрэй Віктаравіч,** прафесар кафедры фізічнай хіміі, доктар хімічных навук

**Мацэвіч Марыя Янушаўна,** дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі навукі, кандыдат філасофскіх навук

*10 лютага*

**Макарэвіч Сяргей Уладзіміравіч,** дацэнт кафедры фізвыхавання і спорту

**Размысловіч Георгій Пракопавіч,** дацэнт кафедры вышэйшай матэматыкі, кандыдат фізіка-матэматычных навук

*13 лютага*

**Рудзь Вячаслаў Рыгоравіч,** галоўны рэдактар часопіса «Веснік БДУ»

*19 лютага*

**Сяменчык Уладзімір Рыгоравіч,** дацэнт кафедры радыёфізікі і лічбавых медыятэхналогій, кандыдат фізіка-матэматычных навук

*22 лютага*

**Гомза Святлана Хрысанфаўна,** дацэнт кафедры англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, кандыдат педагагічных навук

*23 лютага*

**Сініла Галіна Веніяміна ўна,** загадчык кафедры культуралогіі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

*27 лютага*

**Клімянок Валянціна Іосіфаўна,** галоўны навуковы супрацоўнік навукова-даследчай лабараторыі прыкладнога імавернаснага аналізу, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар

**Астаповіч Таццяна Нінэльеўна,** дацэнт кафедры менеджменту і арганізацый аховы здароўя

**Гербік Людміла Францаўна,** загадчык кафедры прыкладной лінгвістыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

*Спіс усіх імяніннікаў размешчаны на сайце БДУ www.bsu.by ў раздзеле «Нашы юбіляры».*

**Паводле інфармацыі ўпраўлення кадраў БДУ**

# БДУ ў СМІ Беларусі

**Рэктар БДУ Сяргей Абламейка пра студэнцкае самакіраванне** – БелТА, naviny.by (07.02), blogger-index.com (08.02).

**«Срэбра» ліцэістаў на адборачнай сесіі інавацыйнага адукацыйнага праекта «CanSat в России»** – БелТА, tut,by (07.02), zvyazda.minsk.by (09.02).

**Свята ліхтароў у РІКК БДУ** – БелТА, 21.by, naviny.by (06.02); «Народная газета», ng.by (07.02).

**Дысцыпліна і жыццё ў студэнцкім гарадку БДУ** – «Рэспубліка» (04.02).

**Гутарка з дырэктарам Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ Давідам Ротманам** – «Минский курьер» (03.02).

**Поспех БДУ ў сусветным вэбаметрычным рэйтынгу ўніверсітэтаў** – Інтэрфакс, БелТА, naviny.by, belniva.by, 21.by, n1.by, telegraf.by, dengi.onliner.by, tut.by, open.by (03.02), БелаПАН (04.02); «Минский курьер», naviny.by (07.02).

**Круглы стол з удзелам начальніка ГУВНМР Людмілай Хухлындзінай па пытаннях прыёмнай кампаніі** – «Рэспубліка», respublika.info (02.02).

**Гутарка з начальнікам цэнтра інфармацыйнай дзейнасці РІКК БДУ Віталем Баравым** – «Белгазета», belgazeta.by (30.01).

**Відэаканферэнцыя міністра адукацыі Беларусі, рэктара і вучоных БДУ з калегамі з Гродна, Расіі, Германіі і Швейцарыі** – «Знамя юности» (27.01-02.02), БелТА (29.01); «Настаўніцкая газета» (31.01).

**Поспехі ліцэістаў на Міжнароднай Жаўтыкоўскай алімпіядзе па матэматыцы, фізіцы і інфарматыцы** – БелТА, 21.by (25.01); «Минск-новости» (27.01).

**Пра Інстытут непарыўнай адукацыі БДУ** – «Комсомольская правда» (25.01).

**Прафесар кафедры гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу БДУ Пётр Зялінскі пра беларуска-польскія стасункі ў 20–40-х гг. ХХ ст.** – «СБ–Беларусь сегодня» (21.01).

**Каментары дэкана эканамічнага факультэта БДУ Міхаіла Кавалёва наконт розных падзей у эканамічным жыцці краіны** – БелТА, БелаПАН, naviny.by, news.mail.ru, tut.by (20.01), «Народная газета», ng.by , tut.by (24.01, 01.02); «СБ-Беларусь сегодня», sb.by, 21.by (26.01).

**Гутарка з рэктарам РІВШ БДУ Міхаілам Дземчуком** – «Настаўніцкая газета», «7 дней», 21.by (19.01).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

СТУДЭНЦКІ ІНТАРЭС

# Творчы дэсант для Еўропы

***Інфармацыйны пункт Савета Еўропы ў Беларусі, які месціцца ў будынку БДУ на Кальварыйскай, 9, упершыню правёў рэспубліканскі конкурс творчых работ «Еўропа – гэта больш, чым ты думаеш». Найлепшыя выявы (постары) адпаведнай тэматыкі цяпер упрыгожаць сталіцу, дапамагаючы мінчукам пазбавіцца стэрэатыпаў пра Еўропу. Пра ход конкурсу і матывацыю ўдзельнікаў распавядае дырэктар інфапункта Ігар ГОРСКІ.***

– Ідэя конкурсу наспела даўно: інфапункт адкрыўся ў 2009 г., і дагэтуль мы працавалі па матэрыялах Савета Еўропы, выкарыстоўвалі іх ідэі інфармацыйных кампаній. А цяпер вырашылі завабіць нашых людзей у творчы працэс – з дапамогай конкурсаў. Конкурс, гульня – адзін з найлепшых інструментаў засваення інфармацыі. Задумалі шэраг конкурсаў на тэмы, апрабаваныя ў межах СЕ. Першы – самы агульны і шырокі, каб паглядзець рэакцыю аўдыторыі, інтарэс і актыўнасць маладых людзей да падобных акцый. Наша аўдыторыя – моладзь ад 16 да 25 гадоў, студэнты, магістранты і нават аспіранты з усёй краіны. Гэта найбольш жывая і крэатыўная аўдыторыя. Звесткі пра конкурс давалі ў асноўным праз інтэрнэт – наш сайт (*www.coe.by*), сацыяльныя сеткі і да т. п. Далі канкурсантам свабоду выяўлення: малюй плакат, рабі фота ці калаж і дасылай у электронным форме на разгляд двух журы – беларускага і еўрапейскага. Для зручнасці на выставе мы ўсе работы раздрукоўваем у аднолькавым фармаце (А2).

***– Ці абмяжоўваеце ўдзел прафесіяналаў – дызайнераў, фатографаў?***

– Пакуль што не. Нам прыйшло 97 прац ад 10 аўтараў. Людзей, як бачыце, няшмат, удзельнічаць яны пачалі вельмі позна – у апошнія дні, мы нават баяліся, што прац у прынцыпе не будзе, падаўжалі тэрмін конкурсу на два тыдні. Таму адсеў пакуль не робім, і нават прафесійны дызайнер ці геній фатаграфіі, калі яму ці ёй ад 16 да 25 гадоў, можа далучыцца. І шкадаваць, што тыя, хто вучыцца на дызайнера, ведаюць і ўмеюць больш, не варта – я ўпэўнены, што і звычайны чалавек, які захапляецца дызайнам ці фатаграфіяй, можа зрабіць працу не горшую. Мы ж не ацэньваем прафесійнасць дызайну, хутчэй выбіраем паводле ідэі: наколькі ўдала ўвасоблена тэма, як яна раскрываецца. Хаця і эстэтычны бок таксама важны, але імкнёмся быць максімальна дэмакратычнымі. У сацыяльных сетках у нас вядзецца інтэрактыўнае галасаванне, маецца і лідар.

***– Для чаго моладзі ўдзельнічаць у падобных конкурсах?***

– Цягам конкурсу мы вельмі здзіўляліся нашай моладзі, што ў яе матывацыя імкнецца да нуля. А ў Еўропе такія конкурсы прыцягваюць вялікую грамадскую ўвагу. Мяркую, уся справа ў матэрыяльным заахвочванні – у адрозненне ад еўрапейскіх конкурсаў, дзе ўсё трымаецца на крэатыве, ахвоце юнакоў данесці іншым свае ідэі, у нас вядзе рэй прагматычны разлік.




*Адна з конкурсных работ*

Адвечнае пытанне нашай моладзі: а што мне за гэта будзе? Адказваю: вам за гэта будзе, па-першае, бясплатнае размяшчэнне вашых прац на выставе, якую мы ладзім адразу пасля падвядзення вынікаў, і таксама на сайце інфапункта і ў сацыяльных сетках. Па-другое, вашы работы будуць раздрукаваны вялікім памерам на якасным матэрыяле і падораны вам жа. Патрэцяе, работы будуць размешчаны ў выглядзе промароліка на маніторах у 70 бізнес-цэнтрах і адміністрацыйных будынках горада: людзі прыходзяць у такі будынак, чакаюць ліфт – і глядзяць на вашу працу, радуюцца. Пачацвёртае, дзесяць найлепшых прац мы раздрукуем у выглядзе постараў фармату А0 і размесцім па буйных ВНУ краіны, а таксама ў выглядзе паштовак, якіх плануем раздаць 20 тыс. Імя аўтара, назва працы, а таксама конкурсу, у якім аўтар пераможа, будзе пазначана на кожнай працы. Мне падаецца, гэта куды лепш, чым бы мы падарылі кніжку ці нават нештa істотнейшае, што можна пакласці на паліцу і забыцца. Людзі даведаюцца пра цябе, пра твае ідэі, а можа, нехта пановаму зірне на Еўропу і яе праблемы – хіба ж гэта не цудоўна? А прызы будуць, мы гэтым займаемся.

***– Якія яшчэ конкурсы плануеце?***

– Адзін ужо распачаўся – яго тэма «Спынім побытавы гвалт», затым прапануем тэму «Супраць дыскрымінацыі ва ўсіх яе формах». Схемы і тэрміны будуць тыя ж. Пакуль правялі пілотны, зусім першы для нас конкурс, даводзілася аператыўна вырашаць шмат пытанняў, спадзяюся, далей будзе лягчэй і лепей.

***– У адзінага ў Беларусі Інфапункта Савета Еўропы вельмі зручнае месца – вакол навучаюцца журналісты, ім толькі дай інфармацыю, разнясуць па СМІ…***

– Увогуле, гэта было сапраўды геніяльнае рашэнне кіраўніцтва БДУ, Міністэрства замежных спраў – адкрыць інфапункт менавіта тут, у Інстытуце журналістыкі. Бо мы працуем з інфармацыяй, і тут яе вельмі зручна распаўсюджваць шырокай аўдыторыі.

***– Але я заўважала, што студэнты праходзяць міма дзвярэй інфапункта, ці то не зважаючы на яго, ці то імкнучыся як найхутчэй прамінуць…***

– На жаль, еўрапейскі сцяг у многіх суайчыннікаў выклікае незразумелую насцярожанасць. Мы яе пераадольваем разнастайнымі сродкамі – праз сацыяльныя сеткі, інфармацыйныя кампаніі, падобныя тэматычныя конкурсы. Зрэшты, для гэтага і існуе інфапункт: каб людзі больш даведаліся пра Савет Еўропы, не блыталі яго з Еўрасаюзам ці АБСЕ, каб актыўна ўдзельнічалі ў конкурсах, абмяркоўвалі агульнаеўрапейскія праблемы. Мы абмежаваныя ў магчымасцях – калі ў Еўропе існуюць гвалбальныя прадстаўніцтвы з мноствам аддзелаў, нас у офісе ўсяго двое: дырэктар і рэферэнт. Праца з насельніцтвам патрэбная велізарная – трэба падштурхнуць людзей асэнсаваць сутнасць Савета Еўропы, зразумець яго асветніцкую дзейнасць.

***– І конкурс, атрымліваецца, гэта такая валанцёрская вам падмога?***

– Своеасаблівы крэатыўны дэсант (*смяецца*). Насамрэч, гэта толькі пачатак. Разам з інфармацыйнымі кампаніямі, семінарамі ды лекцыямі, конкурсы – гэта толькі частка маштабнай і карпатлівай працы.

**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**

ТЭАТРАЛЬНЫ КУФАР

ДАСЯГНЕННІ

# Брэнд года

***Міжнародны фестываль студэнцкіх тэатраў «Тэатральны куфар» БДУ атрымаў сярэбраны медаль у штогадовым конкурсе «Брэнд года–2011».***

Гэты фестываль быў вылучаны экспертным саветам міжнароднага журы конкурсу. Узнагароджанне пераможцаў адбылося ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Адзначым, што «Тэатральны куфар» БДУ быў намінаваны ў катэгорыі «Культура і мастацтва» і саступіў толькі папулярнаму фестывалю мастацтваў «Славянскі базар».

Конкурс «Брэнд года» праводзіцца ў Беларусі ў 11-ы раз. Ён вызначае пераможцаў па стандартах міжнароднай сістэмы EFFIE (ЗША). Гэта значыць, што ўзнагароды могуць прысуджацца толькі пры ўмове выхаду намінантаў на пэўны ўзровень бальных адзнак у працэнтах ад максімальна магчымага – 100%. У нашым выпадку гэты ўзровень склаў 85–70%.

У ВОЛЬНЫ ЧАС

# Еду ў зіму, еду ў «Брыганціну»!

***Як можна не любіць зіму! Гэтая пара года радуе зухаватымі маразамі і зімовымі відамі спорту. Камісія па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні навучэнцаў БДУ і пярвічная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў БДУ не засталіся ўбаку ад арганізацыі актыўнага зімовага баўлення часу. Ужо ў які раз студэнтам універсітэта прапануецца на вакацыях выехаць у любімы САК «Брыганціна». На гэты раз не для выбараў або дэбатаў і не для вучобы сяброў студсавета, а проста на АДПАЧЫНАК.***



45 кіламетраў ад Мінска, і вось яна – сапраўдная зіма. Тут няма ні процьмы людзей, ні затораў, ні паху бензіну. Ужо другі год запар шанцуе з надвор'ем, здаецца, зусім нядаўна ў Мінску была золь і адліга, а за некалькі дзён да ад'езду падмарозіла і выпаў снег. І вось мы прыехалі. Прыехалі ў зіму, у свежае паветра, у «Брыганціну»...

З 24 па 30 студзеня студэнты БДУ маглі атрымаць асалоду ад выдатнай атмасферы. Адпачынак на любы густ. Для аматараў актыўнага адпачынку штодня лыжы, тэніс, більярд, валейбол, басейн. Трэба аддаць належнае і выкладчыкам кафедры фізвыхавання і спорту БДУ, якія сюды прыехалі. Кожны дзень для дзяцей стаў асобным турнірам, на якім можна было выйграць граматы і сувеніры ад прафсаюза. Турніры па валейболе, більярдзе, настольным тэнісе не толькі далі студэнтам матывацыю, але і з'ядналі. Перад вячэрай праходзіла ўшанаванне пераможцаў і ўручэнне прызоў.

Для тых, каму даспадобы больш спакойны адпачынак, была магчымасць разняволіцца на псіхалагічных трэнінгах, дзе закраналі пытанні самаразвіцця, самакантролю, адносін паміж мужчынам і жанчынай. Думаю, парады, якія далі псіхолагі, не застануцца лішнімі для падлеткаў у будучыні.

Тыдзень праляцеў неўзаметку, на свежым паветры добра ўставаць зранку, хацелася ўсюды паспець, усё паспрабаваць і атрымаць як мага больш задавальнення.

Пакідалі зімовую «Брыганціну» з сумам, бо яна прынесла шмат уражанняў, эмоцый, знаёмстваў і добрага настрою. Але са спадзяваннем, што праз год усе мы зноў зможам сказаць з радасцю: «Я еду ў зіму, я еду ў «Брыганціну».

**Кацярына КЛЯЎЗО**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

15 лютага 2012 года
Падпісана да друку 13.02.2012 г.
Зак. . Тыраж 1500 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/0494178 ад 03.04.2009.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, праспр. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
*e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by*

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

# ПСІХАЛАГІЧНАЯ СЛУЖБА

*Псіхалагічная служба БДУ была створана 29 лютага 2000 г. За 12 гадоў дзейнасці стартаваў шэраг паспяховых праектаў. З найбольш яркімі з іх вы можаце пазнаёміцца ў дадзеным бюлетэні.*

*Адбылося шмат яркіх падзей, але мы не спынімся на дасягнутым.*

*Наперадзе мноства задумак, якія мы будзем увасабляць на карысць роднага ўніверсітэта.*

*МЫ ПРАЦУЕМ ДЛЯ ВАС І РАЗАМ З ВАМІ!*

# Разам да поспеху!

## Падтрымка студэнцкіх праектаў

***Студэнты БДУ заўсёды адрозніваліся актыўнасцю і ініцыятыўнасцю. Акрамя вучобы, многія імкнуцца рэалізаваць свае здольнасці, веды і ўменні ў розных сацыяльных праектах. Псіхалагічная служба са свайго боку імкнецца падтрымаць студэнтаў у іх пачынаннях. Для падтрымкі і суправаджэння ідэй і пачынанняў студэнтаў на базе псіхалагічнай службы БДУ была арганізавана творчая майстэрня.***



Творчая майстэрня – гэта від дзейнасці псіхалагічнай службы, накіраваны на падтрымку і дапамогу студэнтам, якія актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці ўніверсітэта (старасты, студэнты актыву, ініцыятары розных праектаў і сацыяльных акцый, валанцёры).

**Што мы робім:**

- праводзім трэнінгі трэнераў, дапамагаем у распрацоўцы і напісанні сцэнарыяў трэнінгаў, сацыяльных акцый, практычных заняткаў,
- аказваем метадычную падтрымку (падбор літаратуры, практычных рэкамендацый),
- праводзім трэнінгі па развіцці навыкаў узаемадзеяння з аўдыторыяй, прамоўніцкага майстэрства, лідарскіх здольнасцяў
- і многае іншае.

Так, з 2008 г. у рамках творчай майстэрні па праграме «Камандаўтварэнне і выяўленне лідарскага патэнцыялу» прайшлі навучанне больш за 300 студэнтаў-удзельнікаў праекта «Студэнцкая куратарская служба», створанага пад эгідай савета старастаў і студэнцкага саюза БДУ. З 2011 г. пачалася праграма трэнінгаў па развіцці кіраўніцкіх навыкаў для сакратароў факультэтаў і кіраўнікоў напрамкаў БРСМ БДУ. Штогод праходзяць навучанне студэнты, актыўна занятыя ў валанцёрскай дзейнасці. Так, напрыклад, удзельнікі гэтага праекта наведалі са сваімі акцыямі школы Ліды і Маладзечна, дзіцячыя дамы ў Слоніме.

Таксама псіхалагічная служба актыўна супрацоўнічае з вучэбнай лабараторыяй «Юрыдычная клініка» і штогод праводзіць заняткі для яе спецыялістаў па тэме «Эфектыўныя зносіны з кліентамі».

Усе праграмы распрацоўваюцца індывідуальна пад кожны праект і запыт.

**Творчая майстэрня вачыма студэнтаў.**

Пра супрацоўніцтва псіхалагічнай службы з ініцыятыўнай групай студэнцкай куратарскай службы БДУ яе кіраўнік – студэнтка 4 курса ДІКСТ **Лагуціна П. В.:**

– Асноўнай задачай студэнта-куратара з'яўляецца знаёмства з групай і яе згуртаванне. Для гэтага на першай сустрэчы студэнт-куратар праводзіць розныя псіхалагічныя трэнінгі і гульні, падрыхтоўка да якіх пачынаецца яшчэ да навучальнага года. У канцы жніўня ўсе студэнты-куратары праходзяць інструктаж па правядзенні трэнінгаў у псіхалагічнай службе БДУ. У асноўным практыкаванні дзеляцца на чатыры віды: практыкаванні на разагрэў, на знаёмства, на згуртаванне групы і на выяўленне лідара. На інструктажы студэнт-куратар атрымлівае метадычныя рэкамендацыі і парады па правядзенні трэнінгаў, даведваецца пра магчымыя праблемы, памылкі і метады іх папярэджання. Таксама ён атрымлівае метадычны дапаможнік «Памочнік куратара», у якім утрымліваецца, акрамя палажэння аб студэнцкай куратарскай службе, і прыклад папкі справаздачнасці, некалькі варыянтаў правядзення трэнінгавых заняткаў на стварэнне спрыяльнага псіхалагічнага клімату ў вучэбнай групе і камандаўтварэнне з комплексам практыкаванняў.

***ПАВАЖАНЫЯ СТУДЭНТЫ!***

*Калі вы актыўныя, цікавіцеся студэнцкім жыццём, у вас ёсць ідэі па стварэнні мерапрыемстваў або розных студэнцкіх праектаў і жаданне ўвасобіць іх у рэальнасць, вы заўсёды можаце звярнуцца да нас па дапамогу і падтрымку.*

*Творчая майстэрня працуе для студэнтаў і разам са студэнтамі.*

***Кантактная інфармацыя:***
***тэл.: (017) 328 60 37,***
***e-mail: psyservice@bsu.by, psychol_bsu@mail.ru.***

# ІНАВАЦЫЙНЫ ПРАЕКТ «МАЛАДЫ СПЕЦЫЯЛІСТ»

***Многія студэнты зацікаўлены ў пошуку працы па спецыяльнасці ў працэсе навучання ва ўніверсітэце. Гэта дае перавагі для прафесійнага развіцця і кар'ернага росту, фінансавую незалежнасць і ўпэўненасць у сабе як у прафесіянале.***

Таму па запыце студэнтаў створаны новы праект ПА ГА «БРСМ» БДУ і псіхалагічнай службы БДУ **«Малады спецыяліст»,** які будзе **карысны для тых, ХТО:**

- Вызначыўся з выбарам прафесіі і знаходзіцца ў актыўным пошуку працы,
- Хоча вылучыцца з масы іншых прэтэндэнтаў,
- Арыентаваны зрабіць прыемнае ўражанне на працадаўцу,
- Імкнецца эфектыўна падкрэсліць свае добрыя якасці.

Праект «Малады спецыяліст» дапаможа вам **выпрацаваць НАВЫК:**

- Прафесійнай самапрэзентацыі,
- Пісьмовага складання рэзюмэ,
- Саманастройкі на сумоўе, асабліва на стрэс-сумоўе.

У рамках праекта вы **ЗМОЖАЦЕ:**

- Прайсці індывідуальнае псіхалагічнае тэсціраванне,
- Прыняць удзел у дзелавых гульнях «Гутарка з працадаўцам»,
- Стварыць уласны імідж спецыяліста,
- Атрымаць кваліфікаваную кансультацыю псіхолага па неабходных для вас прафесійна важных якасцях.

ДЛЯ ЎДЗЕЛУ Ў ПРАЕКЦЕ І ПА ДАДАТКОВУЮ ІНФАРМАЦЫЮ ЗВЯРТАЙЦЕСЯ

**ў псіхалагічную службу БДУ па адрасе: вул. Кастрычніцкая, 2–308 (інт. № 2).** Кантактныя тэлефоны: (017) 328 60 37, (029) 860 40 14 (Ганна), (029) 334 64 33 (Святлана),

**альбо ў ПА «БРСМ» БДУ па адрасе: пр. Незалежнасці, 4–202.** Кантактныя тэлефоны: (029) 666 91 21 (Марына), (029) 252 39 50 (Аляксандр).

# ПЛАН МЕРАПРЫЕМСТВАЎ

## псіхалагічнай службы БДУ на другі семестр 2011–2012 н.г.

### ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ

Чорным колерам адзначаны мерапрыемствы, якія праводзяцца па адрасе: **вул. Кастрычніцкая, 2–308 (інтэрнат № 2),**
сінім – па адрасе: **вул. Кастрычніцкая, 10–111 (інт. № 6),**
зялёным – па адрасе **вул. Курчатава, 8–1 (інт. № 10),**
чырвоным – па адрасе **пр. Дзяржынскага, 87–128 (інт. № 11).**

| Дата | Мерапрыемства | Час |
|---|---|---|
| **13.02** | Псіхалагічная гасцёўня «Дарыць радасць» | 17.00 |
| **13.02** | Псіхалагічная гасцёўня «Меркаванне аб каханні» | 19.00 |
| **14.02** | Навуковае відэа «Твой погляд»: «Хімія кахання» | 19.00 |
| **20.02** | Псіхалагічная гасцёўня «Ківач настрою, або Тэхналогіі кіравання сваім станам» | 17.00 |
| **21.02** | Псіхалагічная гасцёўня «Псіхалагічны сэнс падарунка» | 18.30 |
| **27.02** | Семінар-практыкум «Тайм-менеджмент, або У пошуках страчанага часу» | 18.30 |
| **01.03** | Семінар-практыкум «Антынікацін, або Як зрабіць тое, пра што даўно марыш» | 17.00 |
| **01.03** | Навуковае відэа «Твой погляд»: «У пошуках псіхікі» | 19.00 |
| **12.03** | Практычныя заняткі «Карысныя дробязі, або Развіваем назіральнасць» | 18.30 |
| **14.03** | Псіхалагічная гасцёўня «Кола фартуны, або Калі рызыка апраўданая» | 18.00 |
| **14.03** | Псіхалагічная гасцёўня «Рэцэпты шчаслівых адносін» | 18.30 |
| **14.03** | Семінар-практыкум «Законы прывабнасці» | 18.00 |
| **15.03** | Семінар-практыкум «Грані жаноцкасці і мужнасці» | 18.00 |
| **05.04** | Навуковае відэа «Твой погляд»: «Барацьба са страхам» | 19.00 |
| **09.04** | Семінар-практыкум «Адгадай эмоцыю, ці Што напісана на нашых тварах» | 18.30 |
| **11.04** | Практычныя заняткі «Каракулі і кляксы, або Як расшыфраваць почырк» | 18.00 |
| **16.04** | Трэнінгавыя заняткі «Рэлакс, або Дазволь сабе расслабіцца» | 18.30 |
| **18.04** | Трэнінгавыя заняткі «Эфектыўнае працаўладкаванне» | 18.00 |
| **19.04** | Семінар-практыкум «Падары сабе мару» | 18.00 |
| **19.04** | Семінар-практыкум «Эфектыўная самапрэзентацыя» | 18.00 |
| **25.04** | Семінар-трэнінг «Мастацтва кіраваць сабой» | 18.30 |
| **03.05** | Псіхалагічная гасцёўня «Іспыты проста ў дзясятку» | 18.00 |
| **03.05** | Навуковае відэа «Твой погляд»: «Сакрэты прывабнасці» | 19.00 |
| **10.05** | Семінар-практыкум «Паспяховае працаўладкаванне» | 18.00 |
| **14.05** | Семінар-практыкум «Самаарганізацыя, або Як любіць тое, што робіш, і рабіць тое, што любіш» | 18.30 |
| **16.05** | Семінар-трэнінг «Экзаменацыйны стрэс, або Жыццё падчас сесіі» | 18.30 |
| **16.05** | Практычныя заняткі «Сесія: стратэгія поспеху» | 18.00 |
| **17.05** | Семінар-практыкум «Мой грашовы струмень, або Тэхналогіі прыцягнення грошай у Ваша жыццё» | 17.00 |

### ТРЭНІНГІ І ТРЭНІНГАВЫЯ МОДУЛІ

**вул. Кастрычніцкая, 2–308 (інт. № 2)**

| Мерапрыемства | Дата | Час |
|---|---|---|
| Трэнінг «Таемны шыфр жаночых казак» (5 заняткаў) | **8, 15, 22, 29.02** | 18.30 |
| Трэнінгавыя модулі «Школа лідарства» (4 модулі) | **6-7.02, 5-6.03, 2-3.04, 7-8.05** | 18.00 |
| Трэнінгавыя модулі «Ад мэты да выніку, або Тэхналогіі эфектыўнага планавання і дасягнення мэтаў» (2 модулі) | **19-20.03, 26-27.03** | 17.00 |
| Трэнінгавы модуль «Крэатыўнасць: творчае ўспрыманне рэчаіснасці» | **25-26.04** | 17.00 |

**вул. Курчатава, 8–1 (інт. № 10)**

| Мерапрыемства | Дата | Час |
|---|---|---|
| Трэнінг «Мужчына + Жанчына ... спазнаць і заваяваць» (4 заняткі) | **8, 15, 16, 22.02** | 18.30 |
| Трэнінг «Міжасобасныя канфлікты і шляхі іх пераадолення» (5 заняткаў) | **21, 28.03; 4, 11, 18.04** | 18.30 |

***УВАГА! Трэнінг – цыкл заняткаў па адной тэме. Абавязковае наведванне ўсіх заняткаў. Модулі прадугледжваюць наведванне «два дні запар». Магчымы пропуск асобных модуляў.***

### СТУДЭНЦКІ ПСІХАЛАГІЧНЫ КЛУБ І ВІДЭАСАЛОН

**вул. Кастрычніцкая, 2–308 (інтэрнат № 2). Пачатак – у 19.00.**

**23 лютага.** Яшчэ раз пра каханне, або Шчасце – гэта калі цябе разумеюць!

**29 сакавіка.** Сны: міфы і рэальнасць.

**26 красавіка.** Пасткі сучаснасці, або Залежныя паводзіны.

**24 траўня.** Размаляваў свет усмешкамі, ці Карысць пачуцця гумару.

ВІДЭАСАЛОН:

**12 студзеня.** Як гукнецца, так і адгукнецца. М / ф «Плата наперад».

**9 лютага.** Гэтае дзіўнае каханне. М / ф «Начны парцье».

**15 сакавіка.** Стратэгія поспеху. М / ф «99 франкаў».

**12 красавіка.** Каштоўнасць чалавечага жыцця. М / ф «Знаёмцеся, Джо Блэк».

**10 траўня.** Свежы погляд на праблемы. М / ф «Слухач».

***УВАГА! У праграме магчымыя змены ў сувязі з мерапрыемствамі на факультэтах і ў інтэрнатах. Дадатковая інфармацыя па тэлефонах: (017) 328 60 37, (029) 699 02 59.***

# ІНТЭРАКТЫЎНАЯ ВЫСТАВА «СВЕТ ПСІХАЛОГІІ»

***Інтэрактыўная выстава «Свет псіхалогіі», якая праходзіць у рамках праекта «Дні псіхалогіі», з'яўляецца своеасаблівай візітнай карткай нашай службы. Мэта дадзенага мерапрыемства – інфармаваць студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ пра ўсе разнастайнасці псіхалагічнай практыкі. Акрамя традыцыйнай нагляднай інфармацыі пра напрамкі, формы і метады практычнай псіхалогіі, тут прадстаўлены інтэрактыўныя (заснаваныя на актыўным узаемадзеянні) тэхналогіі.***



Уявіце, што вы ўваходзіце ў адзін з холаў свайго факультэта. Перад вамі – маляўніча афармленыя плакаты, на якіх наглядна прадстаўлена інфармацыя пра супрацоўнікаў псіхалагічнай службы, прынцыпы і метады іх працы. Фотакалажы адлюстроўваюць знакавыя мерапрыемствы нашых спецыялістаў. Таксама на плакатах прадстаўлена цікавая псіхалагічная інфармацыя (ілюзіі ўспрымання, прытчы пра жыццёвы выбар і інш.)

Выдатна, што на выставе вы можаце не толькі быць пасіўным назіральнікам. Напішыце эсэ на тэму «Псіхалогія – гэта...», падзяліцеся меркаваннем наконт псіхалогіі, яе месца ў сучасным свеце, і атрымаеце прыз, бо ўсе заяўленыя эсэ ўдзельнічаюць у конкурсе.

Задайце пытанні, якія вас цікавяць, высокакваліфікаваным спецыялістам, далучыцеся да свету займальнай псіхалогіі, выканайце цікавыя заданні. Таксама ў вас ёсць магчымасць прайсці экспрэс-дыягностыку.

Асаблівую цікавасць традыцыйна выклікае матэрыял, прысвечаны тыпам тэмпераменту. Калі вам цікава пабываць на месцы псіхолага, які ажыццяўляе дыягнастычную работу, мы прапануем вам выканаць спецыяльнае заданне. На лістах паперы – апісанне тыпаў тэмпераменту і ўрыўкі вядомых мастацкіх твораў. Ваша задача – паводле апісання вызначыць тып тэмпераменту ў таго ці іншага літаратурнага героя. Дадзеная частка выставы заўсёды праходзіць вельмі актыўна, удзельнікі з цікавасцю вывучаюць матэрыял, а пасля прапануюць свае рашэнні для любімых літаратурных персанажаў.

Адным з інтэрактыўных элементаў выставы з'яўляецца практыкаванне «Акцёрскае майстэрства». Удзельнікі атрымліваюць урывак тэксту, які трэба прачытаць з пэўнай ролі. Так студэнты асвойваюць адну з тэхнік прамоўніцкага майстэрства, што ў наш час неабходна прадстаўнікам розных спецыяльнасцяў.

**Такім чынам, інтэрактыўная выстава «Свет псіхалогіі» – гэта:**

- цікавыя заданні з галіны займальнай псіхалогіі,
- экспрэс-тэсты,
- практычныя практыкаванні,
- віктарыны, конкурсы,
- непасрэдныя зносіны з псіхолагамі-кансультантамі
- і многае іншае.

Абавязкова наведайце выставу. Менш чым за 20 хвілін вы даведаецеся шмат цікавага і пазнавальнага. Час і месца працы выставы можна даведацца з рэкламы на стэндзе псіхалагічнай службы.

АБ'ЯВА
У сакавіку 2012 г. Дні псіхалогіі праводзяцца ў ліцэі БДУ.
Запрашаем усіх ахвотных наведаць выставу «Свет псіхалогіі».
Прыходзьце, будзем рады вас бачыць!

**УВАГА!** З 6 лютага 2012 года на базе псіхалагічнай службы БДУ адкрыты дыспетчарскі пункт. Яго працу забяспечваюць супрацоўнікі псіхалагічнай службы БДУ, прафесійныя псіхолагі.

**КАЛІ ВЫ ЖАДАЕЦЕ:**

- атрымаць экспрэс-кансультацыю па праблемах зносін, самапазнання, самарэгуляцыі, паспяховай падрыхтоўкі да экзаменаў і г. д.,
- задаць любое пытанне па плануемых мерапрыемствах (трэнінгах, занятках, семінарах),
- падзяліцца набалелым, ведаючы, што вас уважліва выслухаюць і дадуць прафесійную рэкамендацыю,

то вам дастаткова набраць нумар **(017) 328 60 37**

Таксама па гэтым тэлефоне вы можаце запісацца ў трэнінгавую групу і на індывідуальную кансультацыю да псіхолага. Давайце супрацоўнічаць!

**Рэжым працы: панядзелак-пятніца з 17.30 да 19.30. Інфатэлефон (017) 328 60 37.**

# БРЫФІНГ «ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ»,

## АБО ТОЕ, ШТО ВЫ ДАЎНО ХАЦЕЛІ СПЫТАЦЬ У ПСІХОЛАГА

***У рамках Дзён псіхалогіі нарадзіўся адзін з відаў працы, які выклікае вялікую цікавасць як у студэнтаў, так і ў супрацоўнікаў псіхалагічнай службы – брыфінг. Яго мэта – даць студэнтам магчымасць атрымаць адказы псіхолагаў на хвалюючыя пытанні.***



Што ўяўляе сабой брыфінг? На буйных мерапрыемствах псіхалагічнай службы (часцей за ўсё гэта Дні псіхалогіі на факультэтах) студэнты могуць ананімна ў пісьмовым выглядзе задаць пытанне псіхолагу. Пасля гэтага спецыялісты збіраюцца разам і адказваюць на пытанні. Дадзеная працэдура доўжыцца звычайна да позняга вечара, і яе вынікам становіцца шэраг парад, рэкамендацый, тлумачэнняў або практыкаванняў, якія на наступны дзень размяшчаюцца на стэндзе таго факультэта, дзе праводзіліся мерапрыемствы. Такім чынам, кожны студэнт можа падысці і прачытаць адказ на сваё пытанне.

У нашай базе назапасілася велізарная колькасць пытанняў. Найбольш папулярнай тэмай з'яўляецца каханне і адносіны з процілеглым полам: «Як прыцягнуць увагу?», «Як утрымаць каханага?», «Як сваімі ўчынкамі не рабіць балюча блізкім?». На кожнае з гэтых пытанняў былі дадзены адказы. Тут мы падзелімся парадамі, якія падыдуць кожнаму.

Размаўляйце адзін з адным. Адносіны – складаны працэс. Калі размежаваць толькі на інтуітыўнае паразуменне, не заўсёды атрымаецца іх захаваць. Не збірайце крыўды, раздражненне, не адмаўляйцеся ад сваіх жаданняў – кажыце пра гэта. Проста распавядзіце пра свае пачуцці. Не патрабуйце, не маскіруйце пад просьбай загад, проста папрасіце. Блізкі чалавек зразумее і не адмовіць.

Часта задаецца пытанне: «Чаму людзі хлусяць адзін аднаму?». Здольнасць падманваць з'яўляецца ў чалавека прыкладна да 4-х гадоў: дзіця разумее, што дарослыя ведаюць пра яго не ўсё. Адкрыццё ўласнага ўнутранага свету фарміруецца да 7 гадоў. Дзіця разумее, што ў яго могуць быць таемныя думкі і не ўсе з іх абавязкова выказваць. Дарослыя тлумачаць: «Пра гэта ўголас не гавораць», і яе вучыцца замоўчваць праўду. Гэта першая форма падману. Паступова дзіця вучыцца прайграваць «гаму» хлусні – ад хлусні з добрымі намерамі да розыгрышу, праходзячы праз хлусню дзеля збавення.

Задумайцеся, для чаго мы падманваем? Часам, каб не прынесці зла іншаму, абараніць тых, каго кахаем, абараніць свой унутраны свет, пазбегнуць пакарання, атрымаць выгаду, здацца лепшым, атрымаць задавальненне, абараніць свае інтарэсы, дамагчыся праўды, з насмешкай і г. д. Пытанне ў тым, якім чынам кожны чалавек усталёўвае сабе рамкі дапушчальнай хлусні. Імкніцеся быць сумленнымі з самімі сабой і са сваім сумленнем! Вучыцеся будаваць адносіны з іншымі людзьмі на даверы.

Кожны брыфінг прыносіць пытанні, адрасаваныя асабіста псіхолагам: «Псіхолагі ходзяць да псіхолагаў?», «У вас бываюць стрэсы?» і інш. Мы заўсёды адказваем, што псіхолагі – гэта такія ж людзі, як і ўсе астатнія. Таму ў псіхолагаў бываюць і жыццёвыя цяжкасці, і стрэсы. Людзі з псіхалагічнай адукацыяй і практычныя псіхолагі таксама звяртаюцца па псіхалагічную дапамогу. Больш за тое, кансультуючым псіхолагам неабходна прапрацоўваць свае асабістыя праблемы, каб яны маглі працаваць прафесійна.

На брыфінг прыходзяць зусім розныя пытанні – ад глыбока філасофскіх да жартоўных, але часам даводзіцца сутыкацца з вельмі сур'ёзнымі пытаннямі, напрыклад, звязанымі са смерцю блізкага чалавека, працяглымі канфліктамі са значнымі людзьмі, жыццёвымі ўзрушэннямі і інш. Мы, вядома, даём адказы і тут, але разумеем, што фармат брыфінгу не можа дазволіць аказаць неабходную падтрымку студэнтам, якія задаюць падобныя пытанні. Брыфінг дае інфармацыю пра тое, што сярод студэнтаў ёсць тыя, хто мае патрэбу ў падтрымцы. Хочам зрабіць акцэнт на тым, што да нас заўсёды можна звярнуцца па дапамогу, запісацца на кансультацыю і сустрэцца са спецыялістам асабіста.

**Калі ў вас ёсць пытанні, на якія вы шукаеце адказы, то:**

- сачыце за буйнымі мерапрыемствамі псіхалагічнай службы (Дні псіхалогіі, школы актыву, трэнінгі, практычныя заняткі, семінары), дзе пытанне можна задаць спецыялісту,
- вы заўсёды можаце пракансультавацца з псіхолагам па электроннай пошце *psycho_bsu@mail.ru*, *psyservice@bsu.by*,
- вы можаце звярнуцца ў псіхалагічную службу па тэлефоне (017) 328-60-37,
- можна проста прыйсці ў любы кансультатыўны кабінет.

**Давайце на кожнае хвалюючае пытанне шукаць вартыя адказ!**



Нашы супрацоўнікі прынялі ўдзел у арганізацыі школ актыву БДУ. Каля 400 студэнтаў наведалі псіхалагічны трэнінг на камандаўтварэнне, семінар-практыкум «Паспяховае працаўладкаванне» і секцыю «Навыкі эфектыўнай камунікацыі».

У першым семестры 2011/2012 навуч. г. адбылося 5 пасяджэнняў студэнцкага псіхалагічнага клуба і столькі ж відэасалонаў. Клуб працягвае працу. Тэмы пасяджэнняў, запланаваных на другі семестр, глядзіце ў нашым АНОНСЕ.

Дыстанцыйнае псіхалагічнае тэсціраванне ахапіла 2398 студэнтаў-першакурснікаў з 18 факультэтаў. Выражаем падзяку ўсім удзельнікам і арганізатарам праекта!